■ Салдаты Перамогі

# Дэсант прызямліўся... на вайну

## Дзякуючы франтавой загартоўцы радавы Давыд Міхлін да глыбокай старасці меў натрэніраваныя мускулы і плаваў запар па некалькі кіламетраў

**Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, майму дзеду, Давыду Рыгоравічу Міхліну, было 16 гадоў. Ён якраз знаходзіўся ў Ленінградзе: вучыўся на токара. Усе цяжкасці блакаднага горада адчуў на сабе...**



Праз год, у верасні 1942 года, навучэнцаў рамеснага вучылішча эвакуіравалі на баржы праз Ладагу. Пашчасціла не ўсім. Толькі 78 чалавек дабраліся да Масквы. Сярод іх быў і мой дзед. Астатнія рамеснікі загінулі ў блакадным Ленінградзе.

У Маскве Давыда Міхліна накіравалі працаваць на Сакольніцкі вагонарамонтны завод, дзе выраблялі артылерыйскія снарады. Вясной 1943 года дзеда прызвалі ў войска. Трапіў у 17-ю гвардзейскую дэсантную брыгаду, якая дыслакавалася ў горадзе Ступіна Маскоўскай вобласці. Гвардзейцаў вучылі скакаць з парашутам. Скачкі спачатку выконвалі з аэрастата, затым з самалёта «Дуглас». Таксама навабранцаў вучылі страляць, выжываць у экстрэмальных умовах, няўзброенымі весці бой.

6 ліпеня 1943 года ў акруговым артылерыйскім складзе Сярэднеазіяцкай ваеннай акругі адбыўся выбух: боепрыпасы, якія размяшчаліся пад адкрытым небам і ў сховішчах, пайшлі на паветра. Для ліквідацыі наступстваў выбуху брыгаду, у якой служыў мой продак, дэсантавалі ў стэп, недалёка ад месца здарэння.

— Усюды былі раскіданы асколкі снарадаў, мін, гранат, — успамінае дзядуля. — Шмат траплялася і неразарваных боепрыпасаў. Усё гэта збіралася ў асобныя кучы, а затым паўторна падрывалася. Сярод таварышаў па службе знаходзіліся, што называецца «гора-ўмельцы», якія спрабавалі змайстраваць з запальнай трубкі неразарванай гранаты салдацкае крэсіва. Для гэтага вострым прадметам яны стараліся прабіць частку трубкі, але ў гэты час адбываўся невялікі падрыў, які наносіў чалавеку калецтвы. Каму адрывала кісць рукі, каму — пальцы. Камандаванне расцэньвала гэтыя выпадкі як наўмыснае прычыненне шкоды і сурова карала за падобныя правіны.

У канцы лета 1944 года 17-ю гвардзейскую дэсантную брыгаду са Ступіна перавялі ў Беларусь. У Старых Дарогах дабівалі салдат вермахта, здраднікаў і паліцаяў, якія хаваліся ў лясах. У сакавіку 1945-га дзеда ў складзе яго падраздзялення накіравалі на 3-ці Украінскі фронт. Вызвалялі Венгрыю ад фашыстаў, прарывалі пад Аўстрыяй нямецкую абарону паблізу горада Мор.

— Там ішоў жорсткі бой, — расказвае дзядуля. — Наша аддзяленне прасоўвалася наперад уздоўж дарогі. Шчыльнасць агню была такая, што немагчыма ісці ў поўны рост. Паўзлі. Па нас стралялі варожыя мінамёт і кулямёт. Каб наблізіцца да пазіцыі гітлераўцаў, неабходна было перасячы дарожны насып. Як толькі першы баец пасправаваў гэта зрабіць, яго падстрэліў снайпер. Нам паступалі каманды «наперад», але шквал агню над дарогай быў такі, што нікому з байцоў не ўдавалася яе перасячы. Шмат таварышаў тады загінула. Забітыя байцы, загароджваючы нас ад куль і аскепкаў сваімі целамі, далі магчымасць перасячы дарогу. Так метр за метрам мы прасоўваліся наперад. Але варожыя кулі напаткалі і мяне. Я быў паранены ў нагу і руку. Ляжу, сцякаю крывёй, а ў гэты час падпаўзае наш баец. Дастаў перавязачны пакет, толькі пачаў перавязваць мяне, а ў гэты час яго падстрэліў снайпер. Параніла і яго. Санітары падабралі нас ужо пасля заканчэння бою. Гітлераўцы адступалі...

Пасля ранення дзед трапіў у шпіталь у Будапешце, адтуль яго перавялі ў горад Сольнак, затым — у Дэбрэцэн. Як папраавіўся, быў накіраваны ў Чэхаславакію — на захопленым чырвонаармейцамі ваенны завод гітлераўцаў. Там эвакуіраваў у Расію самалёты, якія толькі выходзілі з канвеера. Пасля працаваў у пякарні, а восенню 1945 года вярнуўся ў Беларусь.

Дзядуля часта дастае свае ўзнагароды. Асабліва даражыць ордэнам Айчыннай вайны І-й ступені і медалём «За адвагу». Раней унукі, бывала, прасілі яго, каб паказаў сваю мускулатуру. І сёння памятаю: ён напружваў руку, і трываласць яго мускулаў была такой, што іх нічым нельга было прациснуць. Яшчэ дзядуля мог праплысці некалькі кіламетраў па рацэ без адпачынку. І гэтую загартоўку ён атрымаў на фронце.

Сёння майму дзеду ўжо 90 гадоў. Няма ўжо былых мускулаў, ды і не плавае ён больш. Але ёсць іншае. Гэта годная старасць у акружэнні велізарнай, любячай свайго бацьку, дзеда і прадзеда сям'і — траіх дзяцей, дзевяцярых унукаў і трынаццаці праўнукаў. А яшчэ бязмерная ўдзячнасць новых пакаленняў, для якіх такія, як мой дзед, выратавалі нашу Радзіму і ўвесь свет ад фашызму.

**Марына МІХЛІНА,**
*г. Мінск*

■ Вогненныя вёскі

# РАСОХІ. НЕВЯДОМАЯ ТРАГЕДЫЯ

## Жыхары, якія цудам пазбеглі фашысцкай распраўы, успамінаюць той дзень, як страшны сон

**Многія беларускія вёскі ў гады Вялікай Айчыннай вайны напаткаў лёс Хатыні. Тыя трагічныя падзеі і зараз нагадваюць пра сябе абеліскамі, якія стаяць на месцах, дзе раней былі вёскі.**

Пра трагедыю ў лагойскай вёсцы Расохі няма звестак ні ў літаратуры, ні ў інтэрнэце. Пра тое, што тут загінулі мірныя жыхары, маўкліва сведчыць толькі помнік у вёсцы. Самой жа вёскі няма ні ў адным афіцыйным спісе спаленых з людзьмі населеных пунктаў Беларусі. А ўсё таму, што вогнішча ў той дзень не кранула ні адной хаты паселішча, — жудасная смерць напаткала людзей у пуні.

Расохі знаходзяцца за 8 кіламетраў ад Плешчаніц. На абеліску, які стаіць на месцы спаленай з людзьмі адрыны, напісана: «Тут 20 мая 1944 года фашысцкімі захопнікамі былі спалены жыхары вёскі Расохі...». Побач — прозвішчы дваццаці мясцовых жыхароў. Толькі, па ўспамінах сведак, ахвяр там магло быць больш: у вёсцы хаваліся ад блакады людзі з суседніх паселішчаў.


Помнік на месцы трагедыі ў вёсцы Расохі.

Любоў Апаноўская, старажыл вёскі, была ў той дзень у Расохах. Вось што ўспамінае жанчына:

— Акружыўшы вёску, немцы з паліцаямі сагналі нас усіх у пуню. Затым сказалі: «Хто хворы, не можа ісці або ў каго дзеці малыя, тых павязуць на машыне». А хто яго ведае, куды павязуць? Стаяць людзі і чакаюць. Потым адабралі старых і хворых. Мы, дзеці, з мамай сталі. Сястрычка мая была інвалідам. У нашай суседкі таксама хлопчык-інвалід. Яна і прапанавала забраць дзяўчынку да сябе, а маме быць тут, з астатнімі дзецьмі. Разам з іншымі іх павезлі ў іншую адрыну. Навошта, мы зразумелі, калі неўзабаве праз шчыліны нашай пуні ўбачылі дым.

Такі лёс чакаў і астатніх, каб не «свой» чалавек у паліцыі. Доўгі час іх трымалі ў пуні, потым адпусцілі. Толькі не ўсіх: моладзь, якая засталася ў вёсцы, адправілі на работы ў Германію. Любоў Апаноўская са старэйшай сястрой аказалася на заводзе ў Альтэнбургу.

Пра той страшны дзень у Расохах добра ведае і Ніна Лубнеўская. Яе муж, Казімір, быў родам з гэтай вёскі. Толькі цудам бацька Казіміра (інвалід, хадзіў на мыліцах) не апынуўся ў той адрыне, якая ўспыхнула, як свечка. Лёс усцярог і жыхароў суседняй вёскі Праходы, што таксама трапілі ў пуню, якую гітлераўцы ўжо гатовы былі падпаліць.

— Паліцаі акружылі нашу вёску і загадалі ехаць у Расохі, — успамінае Алена Атрашкевіч. — Выехалі на дарогу, бачым: Расохі гараць. Вымушаны былі ехаць насустрач смерці. У адной пуні людзей ужо палілі. Чакала чаргі другая. Дзякуй Богу, адзін чалавек, які працаваў на немцаў, пагаварыў з імі, і ўсё адмянілі. Можа, пры іншых абставінах гэтага не зрабіў бы, але з намі была яго жонка.

Жыхар вёскі Праходы Вячаслаў Вярбіцкі ў той дзень выратаваўся двойчы. Спачатку яго хацеў застрэліць немец, потым ён трапіў у адрыну, якая мусіла ўспыхнуць другой.

— Каля вёскі партызаны пабудавалі дзоты, рабілі гэта і мясцовыя мужыкі, — расказвае Вячаслаў Вярбіцкі. — Магчыма, за тое, што дзоты знаходзіліся ля вёскі, гітлераўцы вырашылі правесці расправу сярод мясцовых жыхароў. Гналі ў Расохі і нас. Калі мы ўбачылі, што ўдалечыні нешта гарыць, пачалі разбягацца. Уцячы не ўдалося. Калі сталі заганяць у пуню, зразумелі — будуць паліць. Мне ўжо 17 гадоў споўнілася. Не хацеў я такой смерці: думаў, лепш няхай застрэляць.

Набраўся юнак смеласці і даў немцу па твары. Але замест аўтамата ў руках фашыста быў бярозавы калок. Як пачаў ён біць смельчака, што ажно кіёк зламаўся. Заззлаваўшыся, пайшоў за вінтоўкай.

— На мне быў апрануты мой саматканы пінжак, а пад ім — братаў, — расказвае ўдзельнік тых падзей. — Я перапрануўся, шапку вывернуў на іншы бок і сярод баб схаваўся. Хадзіў-хадзіў немец, але так мяне і не знайшоў. Тым часам усіх загналі ў пуню, якую зачынілі на замок. Падкладлі салому. У дзвярах паставілі кулямёты. У людзей пачалася паніка: развітваюцца, цалуюцца, моляцца...

На шчасце, бяда мінавала. Быў у той пуні і Анатоль Матусевіч, жыхар вёскі Траянец. Праўда, мог апынуцца ў той, якую спасціг трагічны лёс.

— Зайшлі да нас у хату немцы, а мы на печы ляжым, — узгадвае Анатоль Матусевіч, якому тады было сем гадоў. — А ў нас галовы павязаны — быццам хворыя на тыф. Адзін, рукамоўны, падышоў і кажа, каб скідалі павязкі. Гэта і выратавала нас ад той пуні, дзе палілі хворых і нямоглых.

У кожнага з іх — свая гісторыя выратавання. Але, безумоўна, найперш у гэтым заслуга нейкага чалавека, які працаваў на гітлераўцаў у Плешчаніцах або (ёсць і такая версія) быў партызанскім сувязным. Нягледзячы на тое, што яго згадваюць усе сведкі, імя гэтага чалавека ўжо не засталося ў памяці. У адрозненне ад таго дня, які людзі, што яго перажылі, без слёз успамінаць не могуць.

**Аляксандр ПАЎЛЮКОВІЧ.** *г. Мінск*
**Фота аўтара**

■ Людзі і лёсы

# ПРАВЕДНІК СВЕТУ ЯЎХІМ

## Мінчанін, якому цудам удалося выбрацца з Трасцянца, змог выратаваць і іншых людзей

**Свята Перамогі, гадавіна вызвалення Мінска... Гэтыя дні маюць глыбокі сэнс для жыхаркі сталіцы Ліліі Яўхімаўны Мызнікавай. Усю вайну яна правяла ў Мінску. Пераежытае засталося ў памяці назаўсёды.**

Яна нарадзілася ў Магілёўскай вобласці. Бацька, Яўхім Малахавіч Болдаў, паходзіў з-пад Шклова. Мама Лілі памерла ў 1939 годзе. Дзевяцігадовая дзяўчынка і старэйшы за яе на чатыры гады брат Яўген (Генік, як называла яго сястра) засталіся з бацькам. Ён быў работнікам сувязі. Перад вайной сям'я жыла ў раёне мінскай вуліцы Чкалава.

Дзяўчынка часта хадзіла праз чыгуначны мост на Суражскі рынак з бітонам — па малако. У адну нядзелю, ідучы па мосце, яна ўбачыла заклапочаных людзей, якія згуртаваліся каля рэпрадуктара: голас дыктара перадаваў паведамленне аб пачатку вайны. На наступны дзень пачаліся бамбёжкі. Дзеці схаваліся з суседзямі ў бамбасховішча. Бацька, прыйшоўшы з працы, адправіўся іх шукаць. Праз некалькі дзён, не знайшоўшы дзяцей, падаўся ў кірунку Шклова. Але па дарозе яго затрымалі немцы, арыштавалі і пасадзілі ў турму, дзе ён знясілеў ад голаду. Потым яго перавялі ў Трасцянец.

Лілія Яўхімаўна памятае, як немцы прыехалі ў Мінск на матацыклах. Добра апранутыя і самазадаволеныя, яны сталі хадзіць па кватэрах у пошуках маёмасці. Пакуль дзеці ціха ляжалі, прыкінуўшыся, нібы спяць, захопнікі вынеслі з іх кватэры коўдры і хатнія рэчы.

За чатыры гады вайны Ліля і Яўген нагледзеліся ў сталіцы нямала жахаў. Фашысты вешалі мінчукоў, звязаных з партызанамі, і падпольшчыкаў на бярозах. Шыбеніцы, на якіх прылюдна каралі юнакоў за сувязь з народнымі мсціўцамі, стаялі ў раёне вуліцы Свярдлова і ў іншых месцах. Горка было глядзець, як немцы гналі аслабленых палонных савецкіх салдат праз мост, і тыя падалі на зямлю.

Неўзабаве дзяцей узяў пад апеку брат маці. Есці яны хадзілі ў дзіцячы дом. Калі дзіцячы прытулак пераехаў у Астрашыцкі гарадок, Генік з Ліляй вырашылі адшукаць бацьку. Нехта з суседзяў дазнаўся, што Яўхім трапіў у Трасцянец. Дзеці выправіліся да лагера пешкі. Баракі толькі яшчэ будаваліся, таму праход быў вольны. Там і знайшлі бацьку.

Набраўшыся храбрасці, дзевяцігадовая Ліля пайшла ў нямецкую адміністрацыю на плошчы Свабоды і пачала прасіць, каб бацьку выпусцілі з лагера, бо яны засталіся без маці і іх няма каму даглядзець. Дзяжурны афіцэр пасадзіў дзяўчынку на куфар, выслухаў і прасіў пачакаць. На дзіва, праз некаторы час бацьку адпусцілі.

Але Яўхім выйшаў адтуль не адзін. Ён выратаваў з гета сваю калегу па працы. Зінаіда Яфрэмаўна была яўрэйкай, мела сына і дачку, мусіла клапаціцца і аб старой маці. Вырашылі сысціся, разам выхоўваць дзяцей. Яўхім разумеў, што за сувязь з ёй яго і дачку могуць пазбавіць жыцця. Але рызыкнулі. Яны пераехалі ў іншае месца, дзе іх не ведалі. Бабулю, якая мела выразную знешнасць, хавалі за печкай, як толькі чуўся грукат у дзверы. Старая кабета была добрай швачкай, яна шыла спадніцы з каляровай тканіны, а Зінаіда Яфрэмаўна перапраўляла іх у вёску і абменьвала на прадукты. Часам яна сыходзіла на некалькі тыдняў з дому, і родныя моцна хваляваліся за яе жыццё. Брата Лілі, Яўгена, забралі ў Германію разам з Астрашыцкім дзіцячым домам. На шчасце, пасля вайны ён вярнуўся.

3 ліпеня 1944 года Ліля ўбачыла першы самалёт з чырвонымі зоркамі, а неўзабаве — і першы танк. Потым з'явіліся савецкія салдаты. Жыхары высыпалі з хованак, сустракалі і кармілі воінаў-вызваліцеляў. Вакол панавала радасць! Яўхіму Малахавічу ўдалося зберагчы сваю сям'ю ад рук карнікаў. Ён прымаў удзел у аднаўленні і адбудоўванні Мінска. Вакол многія дамы былі замініраваныя. У двары дома Болдавых немцы пакінулі склад бомбаў: мінёрам прыйшлося шмат папрацаваць. Салдаты рухаліся далей на захад, вызваляючы новыя прасторы, а жыхары горада паступова прывыкалі да мірнага жыцця.


Лілія Яўхімаўна Мызнікава.

Імя Яўхіма Малахавіча Болдава запісана на сцяне праведнікаў у мемарыяле Яд ва-Шэм у Ізраілі. Рызыкуючы сваім жыццём, гэты просты чалавек у вайну выратаваў яўрэяў. Напэўна, за гэта нехта звыш падарыў яму доўгае жыццё.

**Эла ОЛІНА.**
**Фота аўтара**